нологии FTP-соединений, электронные конференции и форумы укрепляют межбиблиотечные связи, облегчая задачу проведения сравнительных исследований и решают текущие вопросы на корпоративной основе.

*Бігеза В.М.*

## ПАДРЫХТОЎКА БІБЛІЯТЭЧНАГА СПЕЦЫЯЛІСТА ДЛЯ РАБОТЫ З ДЗЕЦЬМІ: РЭГІЯНАЛЬНЫ АСПЕКТ

Сёння вышэйшая навучальная ўстанова разглядаецца як сацыякультурная сістэма, функцыі якой не абмяжоўваюцца падрыхтоўкай чалавека да прафесійнай дзейнасці. Яе неабходна разглядаць як форму трансфармацыі і ўзнаўлення культурных норм, каштоўнасцей, ідэй. Выхаванне духоўнасці будучых спецыялістаў праз адукацыю, арыентаваную на агульначалавечыя каштоўнасці, сусветную і нацыянальную духоўную культуру, з'яўляецца прыярытэтным накірункам вышэйшай школы.

На нашу думку, выхаванню такога спецыяліста на факультэце інфармацыйна-дакументных камунікацый БДУ культуры і мастацтваў будзе садзейнічаць глыбокая падрыхтоўка ў галіне краязнаўства. Асабліва гэта тычыцца спецыялістаў па рабоце з дзецьмі, якія перадаюць набытыя веды, уменні і навыкі ў галіне краязнаўства падрастаючаму пакаленню. Адукацыя і выхаванне студэнтаў у галіне краязнаўства – гэта не толькі напаўненне іх памяці некаторым аб'ёмам інфармацыі, выпрацоўка пэўных уменняў і навыкаў, развіццё інтэлекта, але і выхаванне, па нашаму меркаванню, высокай духоўнасці, якая дапамагае асобе знайсці вышэйшы сэнс жыцця. Менавіта краязнаўчая падрыхтоўка спецыялістаў садзейнічае вывучэнню і пазнанню малой радзімы праз розныя накірункі навукова-практычнай дзейнасці, засваенню і захаванню гістарычнага вопыту грамадства.

У сувязі з гэтым паўстае пытанне "Якімі ведамі ў галіне краязнаўства неабходна валодаць будучаму спецыялісту?" і "Якім павінен быць педагагічны працэс, каб краязнаўчыя веды сталі асобасна значымай каштоўнасцю і садзейнічалі б выпрацоўцы актыўнай жыццёвай пазіцыі, прымушаючы да маральных учынкаў?".

Падрыхтоўка будучага бібліятэчнага спецыяліста ў галіне краязнаўчай дзейнасці патрабуе, безумоўна, комплекснага падыходу. Гэта шматаспектны працэс, які ўключае стварэнне ўмоў для развіцця матывацыйнай, пазнавальнай і валявой сфер. Усе гэтыя галіны чалавечай індывідуальнасці павінны раскрыцца праз механізмы самаразвіцця, накіраванасці на асобасны краязнаўча-префесійны рост, самаактуалізацыю.

На факультэце ІДК існуе спецыялізацыя "бібліятэчна-бібліяграфічнае краязнаўства", на якой адбываецца шматаспектная падрыхтоўка краязнаўцаў для працы з дарослымі чытачамі. Аднак шэраг дысцыплін названай спецыялізацыі не выкладаюцца для будучых бібліятэчных спецыялістаў па рабоце з

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дзецьмі, больш таго, у дысцыплінах вучэбнага плана не адлюстравана спецыфіка краязнаўчай бібліятэчна-бібліяграфічнай дзейнасці дзіцячых бібліятэк.

Між тым, краязнаўчая бібліятэчна-бібліяграфічная дзейнасць разумеецца сёння як спосаб узнаўлення духоўнай культуры, фарміравання нацыянальнай самасвядомасці, маральнага, патрыятычнага выхавання. Менавіта гэтым выклікана з'яўленне новых бібліяграфічных прадуктаў на розных носьбітах, вучэбных праграм для дзяцей па краязнаўстве, пошук новых форм краязнаўчай бібліятэчна-бібліяграфічнай дзейнасці, у тым ліку і навуковых даследаванняў, пошукавай работы сумесна з рознымі іншымі ўстановамі.

І, безумоўна, для абнаўлення краязнаўчай дзейнасці, павышэння яе эфектыўнасці асобую важнасць набывае высокая кваліфікацыйная падрыхтоўка бібліятэкараў і бібліёграфаў-краязнаўцаў. У сувязі з гэтым, нам падаецца мэтазгодным выкладанне на спецыялізацыі "Бібліятэчнае абслугоўванне дзяцей і падлеткаў" курса "Краязнаўчая бібліятэчна-бібліяграфічная дзейнасць дзіцячых бібліятэк". Яшчэ большую важкасць гэтай праблеме надае той факт, што ў нашай краіне няма Рэспубліканскай дзіцячай бібліятэкі, а таксама адсутнічае метадычны цэнтр па краязнаўчай рабоце дзіцячых бібліятэк.

Лекцыйныя, практычныя, лабараторныя заняткі, а таксама самастойная работа ў названым курсе дазволіць студэнтам атрымаць спецыяльную краязнаўчую падрыхтоўку па фарміраванню, размяшчэнню і захоўванню краязнаўчых фондаў дзіцячай бібліятэкі, адметнасцях складу і структуры краязнаўчага даведачна-бібліяграфічнага апарата (КДБА), асновах методыкі бібліяграфавання краязнаўчых дакументаў, стварэнню разнастайных першасных і другасных краязнаўчых дакументаў для дзяцей рознага ўзросту і кіраўнікоў дзіцячага чытання. Гэта, напрыклад, пошукавая летапісная работа, стварэнне разнастайных бібліяграфічных дапаможнікаў у галіне краязнаўчай бібліяграфіі дзіцячай літаратуры: універсальныя, тэматычныя, біябібліяграфічныя і персанальныя краязнаўчыя дапаможнікі. Будучыя спецыялісты павінны ўмець выкарыстоўваць свае веды па ўдасканаленні сістэмы краязнаўчых дапаможнікаў для дзяцей у нашай краіне. Яна павінна быць прадстаўлена сёння асноўнымі тыпамі дапаможнікаў (паказальнік, спіс, агляд), а таксама іх разнастайнасцямі (памяткі, лістоўкі, закладкі, методыка-бібліяграфічныя матэрыялы, календары знамянальных і памятных дат). Пры складанні дапаможнікаў малых форм спецыялісты павінны умець забяспечыць іх анатацыямі, разгорнутымі тэкстамі ў адрас чытачоў, што зробіць гэтыя крыніцы цікавымі і карыснымі.

Актуальнай праблемай, якая патрабуе неадкладнага вырашэння, з'яўляецца стварэнне галіновых бібліяграфічных выданняў, якія дапамогуць вучням усвядоміць краязнаўчыя аспекты асобных прадметаў. Важная задача сёння для бібліёграфаў-краязнаўцаў – стварэнне новых форм і тыпаў выданняў краязнаўчай бібліяграфіі (CD-ROMаў, электронных БД, дайджэстаў, пуцяводнікаў і інш.). Неабходна падкрэсліць, што толькі добра падрыхтаваныя ў рэгіянальным аспекце выпускнікі спецыялізацыі "Бібліятэчнае абслугоўванне дзяцей і падлеткаў" зразумеюць, што стварэнне краязнаўчай бібліяграфічнай прадукцыі для дзяцей – гэта не аднаразовыя мерапрыемствы, а штод-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

зённая праца па вырашэнні педагагічных праблем, звязаных з краязнаўчай работай сярод дзяцей.

Выкарыстанне актыўных форм навучання ў курсе “Краязнаўчая бібліятэчна-бібліяграфічная дзейнасць дзіцячых бібліятэк” будзе садзейнічаць праяўленню індывідуальных якасцей студэнта, абуджэнню інтарэса да краязнаўчай дзейнасці, які, як вядома з педагогікі, з’яўляецца сродкам развіцця здольнасцей і выступае ў якасці пастаяннага стымулюючага механізма пазнання. У сувязі з гэтым узнікае патрэбнасць арганізаваць практычныя заняткі такім чынам, каб яны выклікалі эмацыянальную рэакцыю студэнтаў, цікавасць і жаданне іх выконваць. Гэта могуць быць, напрыклад, дзелавыя гульні, разбор канкрэтных сітуацый, тэсты, займальныя гульні, а таксама распрацоўка групай праекта рэгіянальных аўтарскіх праграм. Складанне апошніх вымагае ад студэнтаў ведаў пазнання гісторыі, асаблівасцей культуры і мастацтва свайго краю, роднай мовы, бытавых і абрадавых традыцый, прыродных асаблівасцей.

Асобна хацелася б падкрэсліць значэнне нашай нацыянальнай літаратуры ў краязнаўчай падрыхтоўцы студэнтаў. Безумоўна, пры выкладанні маюць значэнне цікавыя лекцыі, семінары. Аднак галоўнае, на маю думку, на лепшых узорах выхаваць, навучыць адчуць любоў мастакоў слова да сваёй роднай мовы і Беларусі. Прыкладам можа быць творчасць У. Караткевіча, Н.Гілевіча, В.Вольскага, Я.Пархуты і іншых паэтаў і празаікаў. Сапраўды чалавек, які любіць зямлю на якой нарадзіўся, паважае свой край, што ўзгадаваў яго, робіцца моцны і мудры. Адпаведная літаратурная падрыхтоўка студэнтаў з’яўляецца арыенцірам у сістэме маральных каштоўнасцей. Яна будзе садзейнічаць выхаванню любві да народных традыцый, да роднай мовы, - “Без якой душа – гэта кветка без каранёў, гэта разбітая скрынка, пусты дом” (В.Ластоўскі), а таксама стварэнню беларускамоўнага асяроддзя ў дзіцячай бібліятэцы, творчага падыходу да раскрыцця і больш поўнага камплектавання фондаў краязнаўчай літаратурай, у тым ліку мясцовай перыёдыкай. Выніковасць краязнаўчай работы ў бібліятэцы больш за ўсё залежыць ад асобы бібліятэкара: ад яго творчасці, камунікабельнасці, ад умелага выбару найбольш эфектыўных форм і метадаў дзейнасці. Своеасаблівы падмурак такой дзейнасці (уваходжанне ў прафесію) мы імкнемся сфарміраваць у студэнтаў спецыялізацыі.

Для дасканалай прафесійнай падрыхтоўкі студэнтаў у галіне краязнаўства важнае значэнне, на наш погляд, адводзіцца вытворчай практыцы. Знаходзячыся ў бібліятэцы, студэнты маюць магчымасць паглыбіць свае веды, уменні і навыкі па фарміраванні краязнаўчага фонду, методыцы правядзення сацыялагічных даследаванняў сярод чытачоў, прааналізаваць тэхналогію і методыку бібліяграфічнага абслугоўвання спажыўцоў краязнаўчай інфармацыі. Асобным накірункам краязнаўчай практычнай дзейнасці студэнтаў з’явіцца набыццё ведаў адносна сувязей з органамі мясцовага самакіравання, таварыствам ветэранаў, экалагічнай інспекцыяй, раённым гісторыка-краязнаўчым музеем, школай мастацтваў і інш. Яны змогуць прыняць удзел у распрацоўцы пэўнай сістэмы работы з настаўнікамі і вучнямі ў дапамогу

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вывучэнню тэм па гісторыі і краязнаўству, правядзенні краязнаўчых конкурсаў і алімпіяд, а таксама прэм'ер кнігі, урокаў духоўнасці, Дзён краязнаўства, у арганізацыі і правядзенні сустрэч з вядомымі краязнаўцамі, вывучыць стан укаранення новых тэхналогій у галіне краязнаўства.

Падкрэсліваючы значнасць прафесійнай краязнаўчай падрыхтоўкі спецыялістаў па рабоце з дзецьмі, мы канстатуем неабходнасць практычнай накіраванасці навучання, супрацоўніцтва выкладчыкаў спецыяльных дысцыплін з бібліятэкамі, а таксама ўзаемадзеянне апошніх з мэтай ўдасканалення розных накірункаў краязнаўчай дзейнасці.

Сёння бібліятэкар, які працуе з дзецьмі, павінен не толькі забяспечваць чытача ведамі на ўзроўні сусветных дасягненняў, але і адукаваць яго духоўна. Будучае нашага грамадства вызначаецца тым, што адбываецца ў душах нашых дзяцей. Таму галоўная задача сучаснай школы, бібліятэк, - маральнае выхаванне падрастаючага пакалення. І вялікая роля ў гэтым адводзіцца творчай, цікавай краязнаўчай рабоце дзіцячай бібліятэкі.

*Володина О.Б.*

## УПРАВЛЕНИЕ ВРЕМЕНЕМ КАК ФАКТОР ОПТИМИЗАЦИИ РАБОТЫ МЕНЕДЖЕРА БИБЛИОТЕКИ

*Удержишь в руках сегодняшний день – меньше будешь зависеть от завтрашнего... Все у нас чужое, одно лишь время наше.*

*Луций Сенека*

Работа любого менеджера, прежде всего, направлена на эффективность. Но достижение эффективности в современных условиях быстро изменяющегося мира становится все более трудной задачей. Чаще всего руководитель не принадлежит самому себе: каждый волен занимать его время телефонными звонками, вопросами, посещениями и т.п. Если сюда подключить совещания, проводимые на различных уровнях управления, добавить рутинную работу, то получится, что большую часть своего рабочего времени руководитель тратит впустую. Этот вывод касается руководителей и высшего, и среднего звена. Необходимо также учесть, что работа руководителя с большим трудом поддается нормированию и поэтому основным элементом для повышения эффективности труда становится анализ затрат времени и управление им.

Библиотека как некоммерческая организация, казалось бы, не особенно зависит от того, как организуют свое рабочее время ее руководители. Однако успех и эффективность работы библиотеки чаще всего напрямую зависят от того, насколько правильно расходуют свое и время коллег руководители библиотеки.

Опытные управляющие начинают обычно с анализа своего времени, а не планирования. Для анализа работы руководителя библиотеки подойдут универсальные рецепты. Учет расхода времени можно начать с составления кар-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ